УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра менеджмента інфармацыйна-дакументнай сферы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПЕЦКУРС “АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ”

## Праграма курса для магістрантаў

Мінск 2006

Зацверджана кафедрай менеджмента-інфармацыйна-дакументнай сферы
Пр. № ____ад____________2007 г.

| | | |
|---|---|---|
| **Складальнікі:** | доктар тэхніч. навук | В.В.Нешытой |
| | канд.пед.навук, прафесар | Л.А. Дзямешка |
| | канд.гіст.навук, прафесар | Н.А. Ляйко |
| | канд.філал.навук | С.А. Паўлава |
| | ст.выкладчык | Н.Я. Петушко |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назвы тэм | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекц. | сем. | лаб. | сам. раб. |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | **“Бібліятэказнаўства”. “Абслугоўванне карыстальнікаў”** | | | | | |
| 1 | Формы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк: гістарычны аспект | 2 | 2 | | | |
| 2 | Функцыі, прынцыпы, канцэптуальныяановы бібліятэчнага абслугоўвання | 2 | 2 | | | |
| 3 | Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам | 6 | | 2 | | 4 |
| 4 | Змест прафесіі бібліятэкара ў гістарычным аспекце і на сучасным этапе | 2 | 2 | | | |
| 5 | Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у розных краінах свету: праўнальны аналіз | 6 | | 2 | | 4 |
| 6 | Характарыстыка даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства | 6 | | 2 | | 4 |
| 7 | Характарыстыка асобаснага даследавання ў кантэксце развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь | 4 | | | | 4 |
| | **“Каталагізацыя дакументаў”** | | | | | |
| 8 | Асаблівасці складання бібліяграфічнага апісання для розных інфармацыйна-пашуковых масіваў | 6 | 2 | | | 4 |
| 9 | Стандартызацыя бібліяграфічнага апісання дакументаў ва ўмовах аўтаматызацыі | 6 | 2 | | | 4 |
| 10 | Выкарыстанне класіфікацыйных і прадметызацыйных ІПМ пры фарміраванні інфармацыйных ресурсаў | 4 | 2 | | | 2 |
| 11 | Сучасныя праблемы каталагізацыі | 4 | 2 | | | 2 |
| | **“Матэматыка-статыстычныя метады у бібліятэчнай дзейнасці”** | | | | | |
| 12 | Асноўныя паняцці тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі. | 6 | 2 | | - | 4 |
| 13 | Лічбавыя характарыстыкі выпадковых велічынь. | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| 14 | Нармальны закон размеркавання. | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| 15 | Пабудаванне абагульненых (універсальных) размеркаванняў. | 4 | 2 | | - | 2 |
| 16 | Метады ацэньвання параметраў абагульненых размеркаванняў. | 8 | 2 | | 4 | 2 |
| 17 | Рангавыя размеркаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. | 6 | 2 | | 2 | 2 |
| | | | | | | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **“Бібліятэчны менеджмент”** | | | | | | |
| 18 | Тэарэтычныя асновы менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці | 4 | 2 | | | 2 |
| 19 | Стратэгічнае кіраванне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю | 6 | 2 | | | 4 |
| 20 | Кіраванне інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэцы | 4 | | 2 | | 2 |
| 21 | Кіраванне персаналам | 4 | 2 | | | 2 |
| **“Бібліятэчны маркетынг”** | | | | | | |
| 22 | Асновы маркетынгавай дзейнасці бібліятэкі | 2 | 2 | | | |
| 23 | Сутнасць і агульныя прынцыпы фарміравання сістэмы маркетынгавай інфармацыі | 4 | 2 | | | 2 |
| | **Разам:** | **108** | **36** | **8** | **10** | **54** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

## “БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА. АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ”

### *Тэма 1. Формы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк: гістарычны аспект*

Змена функцый бібліятэк на працягу развіцця грамадства, і эвалюцыя пацэсу бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў. Уплыў філасофіі і ідэалогіі асветніцтва (XIX ст.) на развіццё формаў бібліятэчнага абслугоўвання. Педагагічная тэорыя бібліятэчнай справы, і пазашкольная адукацыя (пачатак XX ст.). Формы бібліятэчнага абслугоўвання членаў педагагічных таварыстваў на Беларусі. Уплыў рашэнняў Сходу бібліятэчных работнікаў (1922г.) на работу бібліятэк. Конкурс на лепшую хату-чытальню (1924г.). Актывізацыя формаў ідэалагічнага ўплыву. “Клубныя” формы дзейнасці бібліятэк. Дэідэалагізацыя бібліятэчнай дзейнасці (канец XX ст.) і формы абслугоўвання чытачоў. Функцыянальная спецыялізацыя публічных бібліятэк. Формы абслугоўвання карыстальнікаў у канцы XIX і пачатку XXст. Уплыў інфматызацыі на грамадства. Глабалізацыя і індывідуалізацыя бібліятэчнага абслугоўвання. Уплыў інфармацыйных і сацыяльных тэхналогій на формы абслугоўвання карыстальнікаў.

### *Тэма 2. Функцыі, прынцыпы, канцэптуальныя асновы бібліятэчнага абслугоўвання*

Характарыстыка функцый абслугоўвання: сацыяльных, псіхалагічных, педагагічных. Рэалізацыя іх у практычнай дзейнасці бібліятэк. Персаніфікацыя поглядаў на сістэму прынцыпаў, іх фармулёвак і разуменняў. Дыскусіі бібліятэказнаўцаў. Падыходы да іх вызначэння і класіфікацыі. Характарыстыка зместу прынцыпаў: мэтазгоднасці, развіцця, дэмакратызацыі, камфортнасці.

Перамены ў канцэптуальных асновах бібліятэчнага абслугоўвання:

- пераасэнсаванне марксісцка-ленінскай монаідеалагізацыі на прызнанне поліідэалогіі ў абслугоўванні;
- пераход з цэнтралізацыі на дэцэнтралізацыю;
- перагляд бібліяцэнтрысцкай ідэі і зварот да яе;
- уплыў новых інфармацыйных і сацыяльных тэхналогій.

Асноўныя канцэпцыі тэарэтычнага асэнсавання бібліятэчнага абслугоўвання.

### *Тэма 3. Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карытальнікам бібліятэк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў эканамічных, сацыяльных, адукацыйных, навуковых, культурных накірункаў развіцця грамадства на тэхналагічны працэс абслугоўвання. Іх спалучэнне. Класіфікацыйная схема бібліятэчных паслуг.

***Тэма 4. Змест прафесіі бібліятэкара ў гістарычным аспекце і на сучасным этапе***

Эвалюцыя ўяўленняў аб прафесіі ў XIX – пачатку XX ст. Прычыны зніжэння статуса бібліятэкара ў XX ст. Уплыў арганізацыі і формаў работы бібліятэк у XXI ст. на імідж прафесіі. Змест прафесіі бібліятэкара ў інфарматызаваным грамадстве. Бібліятэкар як інфармацыйны спецыяліст і як сацыяльны работнік. Характэрныя рысы дзейнасці бібліятэкара на сучасным этапе. характарыстыка зместу дзейнасці.

***Тэма 5. Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у розных краінах свету: праўнальны аналіз***

Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у Беларусі, Расіі, у краінах Еўропы: Германіі, Англіі, Францыі, Балгарыі, Польшчы, ЗША. Агульныя і спецыфічныя рысы ў падрыхтоўцы кадраў.

*Навуковы семінар* “Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у розных краінах свету”

*Заданні магістрантам да навуковага семінару*:

- падабраць і прааналізаваць матэрыял аб падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў у розных краінах свету;
- скласці картатэкі і падаць выкладчыку;
- падрыхтаваць абагульняючыя рэфераты, у якіх вызначыць агульнае і спецыфічнае ў падрыхтоўцы кадраў.

Семінар праводзіцца ў форме абмеркавання матэрыялаў.

***Тэма 6. Характарыстыка даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства***

Вывучэнне і аналіз даследаванняў, якія праводзяць Рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

*Круглы стол* “Даследчая работа ў галіне бібліятэказнаўства: стан і праблемы”

*Заданні магістрантам да “круглага стала”:*

- выбраць адну бібліятэку і прааналізаваць яе даследчую дзейнасць на працягу апошніх 5 гадоў;
- падрыхтаваць матэрыялы да абмеркавання за круглым сталом.

***Тэма 7. Характарыстыка асабістага даследавання ў кантэксце развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь***

На падставе матэрыялаў, выкладзеных за круглым сталом “Характарыстыка даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства”прааналізаваць, выявіць наваўвядзенні і прабелы ў асабаснай магістэрскай дысертацыі.

Матэрыялы падаць выкладчыку ў выглядзе рэферата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| СРМ | Гадзіны | Форма кантролю |
|---|---|---|
| Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карытальнікам бібліятэк. | 4 | Навуковы семінар |
| Характарыстыка даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства. | 4 | Круглы стол |
| Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у розных краінах свету: праўнальны аналіз | 4 | Навуковы семінар |
| Характарыстыка асабістага даследавання ў кантэксце развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь. | 4 | Рэферат |

***Літаратура:***

1 Бибилиотечное дело – 2000: проблема информирования открытого информационного общества: В 2 ч. – Мн.,2000.– Ч.1. – 189с.; Ч.2. – 213с.

2 Библиотечные компьютерные сети: Сб.ст.(Ред.-сост. Е.И. Кузьмин,М.Н. Усачеев.– М.: Либерия, 2005. –224с.

3 Брежнева, В.В. Информационное обслуживание: Учеб.-практ. пособие / В.В.Брежнева, В.А.Минкина. – СПб., 2004. – С.57 – 71.

4 Гаронина, Г. Сервисные инновации: теоретическое обоснование/ Г.Гаронина // Библиотека. – 2001. – № 8. – С.50.

5 Гаронина, Г.А. Сервисные инновации: теоретическое обоснование / Г.А. Гаронина // Библиотека.– 2001.–№8.-С.50.

6 Дворкина, М.Я. Библиотечное обслуживание как система: Учеб. пособие / М.Я.Дворкина. – М., 1992. – 162с.

7 Дворкина, М.Я. Библиотечное обслуживание: теоретический аспект / М.Я. Дворкина. – М., 1993. – 248с.

8 Дворкина, М.Я. Информационное обслуживание: социо-культурный подход /М.Я. Дворкина. - М.:ИПО "Профиздат", 2001. - С.46-57.

9 Дворкина, М.Я. Информационное обслуживание: социо-культурный подход / М.Я. Дворкина. - М.,2001. - 110с.

10 Дворкина, М.Я. Эффективность и качество работы с читателями: Лекции /М.Я. Дворкина // М.: Моск.гос.ун-т культуры, 1998.-31с.

11 Дзямешка, Л.А. Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк: Вучэб.дапам.:/ Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава. – Мн., 2007.– 119с.

12 Дзямешка, Л.А. Бібліятэчнае абслугоўванне карыстальнікаў у гістарычным аспекце / Л.А.Дзямешка // Веснік Бел. дзярж. ін-та праблем культуры.– 2005.– № 1 (3 – 4) – С.135 – 144.

13 Дзямешка, Л.А. Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк /Л.А. Дзямешка //Веснік БДУКіМ. - 2004. - №3. - С.103–108.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14 Дзямешка, Л.А. Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк /Л.А. Дзямешка // Веснік БДУКіМ. - 2004. - №3. - С.103–108.
15 Дзямешка, Л.А. Развіццё формаў абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк / Л.А.Дзямешка // Веснік БДУКіМ. - 2002. - №1. - С.50.
16 Дзямешка, Л.А. Развіццё формаў абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк / Л.А.Дзямешка // Веснік БДУКіМ. -2002. - №1. - С.80 – 84.
17 Дзямешка, Л.А. Эвалюцыя ўяўлення аб прафесіі бібліятэжкара / Л.А. Дзямешка // Роль б-к и информации в устойчивом развитии общества: междунар. научно-практ. конф. Минск 25 – 27 окт. 2005. – Мн.: Красико – Принт, 2006. – С.40–45.
18 Концепция информационного взаимодействия библиотек Беларуси. – Мн., 2001. – 47с.- (Белорусская библ. ассоциация).
19 Манифест ЮНЕСКО о публичных библиотеках 1994 // Библиотека. – 1995. – № 6. – С.6
20 Матлина, С.Г. Привлекательная библиотека, или Что может реклама / С.Г. Матлина. – М., 1997. – 95с.
21 Петушко, Н.Е. Библиотечное обслуживание инвалидов по зрению: теоретический аспект / Н.Е. Петушко // Бібліятэчны свет. – 2003.–№3. –С.18 – 20.
22 Российское библиотековедение: XX век. Направления развития, проблемы и итоги. – М., 2003. – 420с.
23 Яцевич, Н.А. Информатизацыя в библиотеках Белоруссии /Н.А. Яцевич // Библиотечный свет. -1999. -№2. -С.21–24.
24 Текущий архив Национальной библиотеки Белоруссии за 2006 год / Научный отдел библиотековедения.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАТЭМАТЫКА – СТАТЫСТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ У БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### *Тэма 1. Асноўныя паняцці тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі*

Выпадковыя падзеі. Віды выпадковых падзей. Асноўныя тэарэмы тэорыі імавернасцей. Тэарэма складання імавернасцей (несумесных падзей). Тэарэма множання імавернасцей (незалежных падзей).

Выпадковыя велічыні і іх законы размеркавання. Віды выпадковых велічынь (непарыўныя, дыскрэтныя). Паняцце закона размеркавання. Функцыя размеркавання. Шчыльнасць размеркавання, яе уласцівасці.

Генеральная і выбаркавая сукупнасці. Просты статыстычны рад. Ранжыраваны рад. Інтэрвальны рад размеркавання. Парадак пабудовы гістаграмы.

### *Тэма 2. Лічбавыя характарыстыкі выпадковых велічынь*

Паказчыкі становішча: мода, медыяна, матэматычнае чаканне. Паказчыкі рассейвання: дысперсія, сярэдняе квадратовае адхіленне, каэфіцыент варыяцыі і іх уласцівасці. Моманты (пачатковыя, цэнтральныя). Паказчыкі асіметрыі і эксцэса.
*Лабараторная работа* Вылічэнне лічбавых характарыстык выпадковых велічынь.

### *Тэма 3. Нармальны закон размеркавання*

Асаблівасці і ўласцівасць нармальнага закона размеркавання. Правіла "трох сігма". Даверальная імавернасць і даверальны інтэрвал. Кропкавая і інтэрвальная адзнакі матэматычнага чакання выпадковай велічыні.
*Лабараторная работа* Нармальны закон размеркавання. Даверальная імавернасць. Даверальны інтэрвал для матэматычнага чакання выпадковай велічыні.

### Тэма 4. Пабудаванне абагульненых (універсальных) размеркаванняў

Метады пабудавання абагульненых размеркаванняў (метад К. Пірсана, метад абагульнення). Тры сістэмы непарыўных размеркаванняў. Размеркаванні груп А і Б. Класіфікацыя размеркаванняў. Вылічэнні нармаванага множніка. Размеркаванні функцый выпадковых аргументаў.

### *Тэма 5. Метады ацэньвання параметраў абагульненых размеркаванняў*

Метад найменшых квадратаў. Метад найбольшага праўдападабенства. Класічны метад момантаў.

Крытэрыі для ўстанаўлення тыпу раўнаванай крывой па метаду момантаў. Выкарыстанне номаграмы.

*Лабараторная работа*
1. Метад найменшых квадратаў. Метад найбольшага праўдападабенства.
2. Класічны метад момантаў.

### *Тэма 6. Рангавыя размеркаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Форма прадстаўлення рангавых размеркаванняў.

Крытэрый аднароднасці рангавых размеркаванняў, выдзяленне неаднароднай часткі

Універсальныя законы рассейвання і старэння публікацый.

Закон рассейвання публікацый (у сэнсе Брэдфарда) як вынік уласцівасцей універсальнага закона.

Месца закона Ціпфа ў сямействе рангавых размеркаванняў.
*Лабараторная работа* Рангавыя размеркаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| СРМ | Гадзіны | Форма кантролю |
|---|---|---|
| Асноўныя тэарэмы тэорыі імавернасцей. Тэарэма складання імавернасцей (несумесных падзей). Тэарэма множання імавернасцей (незалежных падзей).<br>Парадак пабудовы гістаграмы. | 4 | Навуковы семінар |
| Моманты (пачатковыя, цэнтральныя). Паказчыкі асіметрыі і эксцэса. | 2 | Навуковы семінар |
| Давяральная імавернасць і давяральны інтэрвал. Кропкавая і інтэрвальная адзнакі матэматычнага чакання выпадковай велічыні. | 2 | Дыскусія |
| Размеркаванні функцый выпадковых аргументаў. | 2 | Навуковы семінар |
| Метад найбольшага праўдападабенства. | 2 | Навуковы семінар |
| Закон рассейвання публікацый (у сэнсе Брэдфарда) як вынік уласцівасцей універсальнага закона.<br>Месца закона Ціпфа ў сямействе рангавых размеркаванняў. | 2 | Рэферат |

***Літаратура:***


1 Вентцель Е.С. Теория вероятностей. – М.: Физматгиз, 1962. – 576.
2 Герасимович А.И., Матвеева Я.И. Математическая статистика. – Мн.: Вышэйшая школа, 1978.
3 Гмурман В.Е. Введение в теорию вероятностей и математическую статистику. – М.: Высшая школа, 1966.
4 Нешитой В.В. Система непрерывных распределений в информатике и лингвистике // НТИ. Сер.2. – 1984. – №3. – С. 1 – 6.
5 Нешитой В.В. Исследование ранговых распределений // НТИ. Сер.2. – 1985. - №2. – С. 16 – 20.
6 Нешитой В.В. Форма представления ранговых распределений // Учёные записки Тартуского гос. ун-та. – 1987. – Вып. 774. – С. 123 – 134.
7 Нешитой В.В. Методы статистического анализа на базе обобщённых распределений: Учеб.-метод. пособие. – Мн., Веды, 2001. – 168 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# <u>БІБЛІЯТЭЧНЫ МЕНЕДЖМЕНТ</u>

## *Тэма 1. Тэарэтычныя аспекты менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Навука кіравання як галіна грамадскай навукі, у задачы якой ўваходзяць выпрацоўка і тэарэтычная сістэматызацыя ведаў аб кіраванні грамадствам, рознымі галінамі матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Мэты і задачы навукі кіравання, яе структура.

Рздзелы навуковага кіравання бібліятэка-інфармацыйнай дзейнасці: тэорыя кіравання, арганізацыя пабудовы суб’екта і аб’екта кіравання; метады фарміравання кіраўнічага ўздзеяння; працэс кіравання; навуковая арганізацыя працы ў кіруючай сістэме.

Характэрныя рысы навуковага кіравання і заканамернасці кіраўнічай дзейнасці бібліятэк. Сістэмны, працэсны і сітуацыйны падыходы да кіраўнічай дзейнасці.

Характарыстыка бібліятэчнага менеджменту як навуковай дысцыпліны, якая вывучае арганізацыйныя і сацыяльныя аспекты кіравання бібліятэчнай дзейнасцю. Рацыянальнае выкарыстанне чалавечых, матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў.

Фарміраванне канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту. Выкарыстанне канцэпцый менеджменту ў рэфармаванні кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю ў Беларусі. Этапы фарміравання менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Уклад айчынных і замежных бібліятэказнаўцаў у фарміраванні асноў бібліятэчнага менеджменту.

## *Тэма 2. Стартэгічнае кіраванне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю*

Канцэпцыя стратэгічнага менеджменту. Пасылкі праяўлення стратэгічнага менеджменту. Месца і значэнне стратэгічнага менеджменту ў кіраванні сучаснай бібліятэкай. Развіццё стратэгічнага менеджменту. Сутнасць стратэгічнага менеджменту. Асноўныя складовыя стратэгічнага менеджменту.

Этапы стратэгічнага кіравання. Вызначэнне місіі. Роля місіі ў жыццядзейнасці бібліятэкі. Правядзенне аналізу асяроддзя. Аналіз знешняга асяроддзя: эканамічныя, прававыя, сацыяльныя, тэхналагічныя кампаненты. Аналіз унутранага асяроддзя бібліятэкі. Выпрацоўка стратэгіі арганізацыі: тыпы стратэгій, вызначэнне стратэгіі, ацэнка стратэгіі.

Кампаненты рэалізацыі стратэгіі: тактыка, палітыка, правілы, працэдуры.

Стратэгічнае планаванне ў бібліятэцы: вызначэнне і значэнне.

Сацыяльна-культурнае праграмаванне: сучасныя канцэпцыі і арганізацыйныя прынцыпы. Значэнне сацыяльна-культурнага праграмавання ў рэгіянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітыцы. Асноўныя этапы ў распрацоўцы праграм: структурыраванае апісанне рашаемай праблемы, выпрацоўка мэтаў і прыярытэтных накірункаў праграмы; разгорнутае апісанне стратэгіі рашэння праблемы; выбар форм і парадку арганізацыі стратэгіі, ацэнка эфектыўнасці і кантроль за рэалізацыяй праграмы.

Класы праграм у сацыяльна-культурнай сферы: іх характарыстыка і значэнне ў арганізацыі культурнага асяроддзя. Мегапраекты як мэтавыя праграмы развіцця культуры на рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях. Мультыпраекты як мэтавыя комплексныя праграмы на ўзроўні малога гораду. Монапраекты бібліятэкараў.

### *Тэма 3. Кіраванне інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэках*

Інавацыйная дзейнасць у бібліятэках, яе значэнне і змест. Асноўныя этапы інавацыйных працэсаў у бібліятэцы. Новаўвядзенні, іх выяўленне, вывучэнне і абагульненне. Прапаганда новаўвядзенняў у бібліятэках. Кіраванне новаўвядзеннямі ў бібліятэках: стварэнне новаўвядзенняў з дапамогай эксперыментальных метадаў, іх ужыванне і дапамога бібліятэкам у засваенні.

### *Тэма 4. Кіраванне персаналам як накірунак менеджменту*

Функцыі кіравання персаналам у сучасных умовах. Канцэпцыя “персанал – стратэгіі”. Склад функцыянальных блокаў па кіраванні персаналам бібліятэкі. Планаванне патрэб у персанале. Маркетынг персаналу, асноўныя прынцыпы, віды дзейнасці, этапы. Падбор кандыдатаў і адбор персаналу: арганізацыя і працэдуры. Прафесіяграмы і персанаграмы. Вызначэнне спосабаў падбору работнікаў. Адбор кандыдатаў, метады і працэдуры. Прафесіянальныя выпрабаванні. Субяседванне. Кіраванне працоўным патэнцыялам. бібліятэкі. Растаноўка персаналу. Сацыяльная і прафесійная адаптацыя персаналу. Працоўныя перамяшчэнні: віды, формы. Распаўсюджанне гібкіх форм занятасці (няпоўная занятасць, часовае працаўладкаванне). Ратацыя работнікаў.

Ацэнка персаналу, метады ацэнкі супрацоўнікаў: ацэнка вынікаў работы, ацэнка патэнцыялу, крытэрыі ацэнкі. Атэстацыя супрацоўнікаў.

Кіраванне развіццем персаналу. Віды прафесійнага навучання. Стымуляванне працэсу навучання. Сучасныя тэхналогіі ў навучанні. Формы і метады прафесійнага навучання ў бібліятэках. Матывацыя працоўнай дзейнасці. Асноўныя паняцці: матыў, патрэбы, інтарэс, устаноўка, структура матываў працоўных паводзін. Сучасныя тэорыі матывацыі. Формы і метады стымулявання працоўнай дзейнасці. Эканамічная і сацыяльная эфектыўнасць матывацыі.

| СРМ | Гадзіны | Форма кантролю |
|---|---|---|
| Дыверсіфікацыя бібліятэчнага менеджменту | 2 | Дыскусія |
| Упраўленне праектнай дзейнасцю бібліятэк | 4 | Практычныя заняткі (дыскусія) |
| Метадычны маніторынг. Аналітычная дзейнасць бібліятэк | 2 | Навуковы семінар |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Матывацыя працоўнай дзейнасці бібліятэкару як функцыя менеджменту | 2 | Навуковы семінар |

**Літаратура:**


1 Авдулова, Т.П. Психологические аспекты менеджмента: Учебно-методическое пособие. – М.: Либерия – Бибинформ, 2005. – 154 с.

2 Головко, С.И. Специалист: образование, комплектность, новаторство: Научно-практическое пособие. – М.: Либерия – Бибинформ, 2005. – 144 с.

3 Дригайло, В.Г. Основы научной организации труда в библиотеке: Учебно-метод. пособие. – М.: Либерия – Бибинформ, 2005. – 424 с.

4 Дубровина, Л.А., Кочетов, А.И. Руководство по организации самооценки внутрибиблиотечных систем обеспечения качества деятельности и услуг: Метод. пособие. – М.: Либерия, 2004. – 120 с.

5 Зайцева, Т.А. Современные методики делопроизводства в библиотеке: Учеб-метод. пособие. – М.: Либерия, 2004. – 128 с.

6 Зборовская, Н.В. Деловые игры для занятий библиотечных специалистов: Сборник метод. материалов. – М.: Либерия – Бибинформ., 2005. – 120 с.

7 Кактерев, А.И. Менеджмент знаний: от теории к технологиям: Научно-метод. пособие. – М.: Либерия-Бибинформ, 2005. – 296 с.

8 Коряновцева, Н.А. Техники информационно-библиотечной работы: Учеб. – практ. пособие. – М.: Либерия, 2004. – 136 с.

9 Суслова, И.М. Библиотека в системе некоммерческого маркетинга: Учебно-метод. пособие для вузов, колледжей культуры и искусств. – М.: Профиздат, 2003. – 160 с.

10 Суслова, И.М., Кармовский, В.В. Менеджмент в современной библиотеке: Научно-метод. пособие. – М.: Либерия, 2004. – 176 с.

11 Чуприна, Н.Т. Универсальная библиотека: инновационная деятельность в профессиональной практике: Научно-практ. пособие. – М.: Изд-во Либерия, 2004. – 120 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## БІБЛІЯТЭЧНЫ МАРКЕТЫНГ

### *Тэма 1. Асновы маркетынгавай дзейнасці бібліятэкі*

Маркетынгавая дзейнасць: асноўныя паняцці. Напрамкі і асноўныя этапы маркетынгавых даследаванняў. Маркетынгавае асяроддзе, ў якім функцыянуе бібліятэка.

Інфармацыйны рынак. Галоўныя састаўляючыя працэса прыняцця рашэння аб пакупцы інфармацыйных прадуктаў і паслуг: асазнанне праблемы, пошук інфармацыі, адзнака варыянтаў, рашенне аб пакупцы, рэакцыя на пакупку. Сегментацыя рынка. Выбар мэтавых сегментаў. Пазіцыяніраванне тавару. Распрацоўка тавару. Устанаўленне цэн на тавары. Распаўсюджванне тавару. Прасоўванне тавару.

Планаванне маркетынга інфармацыйных прадуктаў і паслуг, асноўныя раздзелы плана. Стратэгічны кантроль як сродак адзнакі агульнага падыходу да інфармацыйнага рынку. План рэвізіі (сітуацыйнага аналізу) як сродка выяўлення праблем і выдачы рекамендацый адноснага плана дзеяння па ўдасканаленню маркетынгавай дзейнасці бібліятэкі. Характарыстыка асноўных раздзелаў плана рэвізіі (сітуацыйнага аналізу) маркетынга: маркетынгавага асяроддзя; стратэгіі маркетынга; арганізацыі службы маркетынга; сістэм маркетынга (сістэмы маркетынгавай інфармацыі і сістэмы планавання і кантроля маркетынга); рэзультатыўнасцімаркетынга (прыбытку, эфектыўнасці затрат, цэн на інфармацыйныя прадукты і паслугі).

### *Тэма 2. Сутнасць і агульныя прынцыпы фарміравання сістэмы маркетынгавай інфармацыі*

Канцэпцыі сістэмы маркетынгавай інфармацыі. Мэта, задачы, функцыі, структура маркетынгавай інфармацыі. Маркетынгавая інфармацыя як сродак рэалізацыі кіраўнічых рашэнняў. Характарыстыка асноўных складаючых маркетынгавай інфармацыі: макраасяроддзя; мікраасяроддзя; аб'ектаў маркетынгавых даследванняў; аб'ектаў сітуацыйнага аналізу. Уплыў стану рынка на сістэму маркетынгавай інфармацыі.

Падсістэма ўнутранай інфармацыі. Падсістэма знешняй інфармацыі. Падсістэма інфармацыі аб аб'ектах маркетынгавых даследванняў. Падсістэма інфармацыі аб аб'ектах сітуацыйнага аналізу. Адзел маркетынгавай інфармыцыі як структурнае падраздзяленне службы маркетынга ў бібліятэцы.

| **СРМ** | **Гадзіны** | **Форма кантролю** |
|---|---|---|
| Інфармацыйны рынак Беларусі: стан і перспектывы развіцця | 2 | Рэферат |

### *Літаратура:*


1 Герасимова, Л.Н. Маркетинг информационных продуктов и услуг: Учеб. пособие: В 2 ч. / Л.Н. Герасимова [Моск.гос.ун-т культуры. – Ч.1. Основы маркетинговой деятельности.– М., 1995.– 71с.; Ч.2 Информационные ресурсы маркетинга.– М., 1997.– 115с.].

2 Клюев, В.Г. Ценообразование и ценовой маркетинг в библиотеке: Науч.-методич. пособие / В.Г. Клюев, Н.П. Абакумова.– М., 1997.– 86с.

3 Клюев, В.Г. Маркетинг в системе управления библиотекой: Учеб. пособие / В.Г. Клюев, Е.М. Ястребова.– М.: МГУК, 1995.– 132 с.

4 Клюев, В.Г. Маркетинговая ориентация библиотечно-информационной деятельности: Учеб. пособие / В.Г. Клюев, Е.М. Ястребова.– М.: Профиздат, 1999.– 144 с.

5 Паршукова, Г.Б. Маркетинговые основания в библиотечной деятельности: Учеб. пособие / Г.Б. Паршукова; ГПНТБ СО РАН.– Новосибирск, 2005.– 151 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6 Песоцкая, Е.В. Маркетинг услуг: Учеб. пособие / Е.В. Песоцкая.– СПб.: Питер, 2000.– 157 с.
7 Суслова, И.М. Практический маркетинг в библиотеках: Учеб.-методич. пособие / И.М. Суслова.– М.: ЛИБЕРИЯ, 2004.– 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Формы абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк: гістарычны аспект.
2. Функцыі, прынцыпы, канцэптуальныя асновы бібліятэчнага абслугоўвання.
3. Інавацыйныя працэсы і традыцыі ў прадастаўленні інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк.
4. Змест прафесіі бібліятэкара ў гістарычным аспекце і на сучасным этапе.
5. Падрыхтоўка бібліятэчных кадраў у розных краінах свету: параўнальны аналіз.
6. Сістэмная характарыстыка даследчай работы ў галіне біблітэказнаўства.
7. Характарыстыка сучасных тэхналогій ў бібліятэчным абслугоўванні карыстальнікаў.
8. Характарыстыка асабістага даследавання ў кантэксце развіцця бібліятэчнай справы ў РБ.
9. Статус бібліятэкара і шляхі падняцця іміджа прафесіі.
10. Сутнасць метадаў ацэньвання параметраў апраксіміруючых размеркаванняў: найменшых квадратаў, найбольшай праўдападобнасці, метада момантаў.
11. Паняцце рангавага размеркавання. Форма прадстаўлення рангавых размеркаванняў.
12. Крытэрый аднароднасці рангавых размеркаванняў, выдзяленне неаднароднай часткі.
13. Універсальныя законы рассеяння і старэння публікацый.
14. Закон рассеяння публікацый (у сэнсе Брэдфорда) як вынік уласцівасцей універсальнага закону.
15. Паняцце закона размеркавання выпадковай велічыні.
16. Генеральная і выбарная сукупнасці. Просты статычны рад. Ранжыраваны рад размеркавання.
17. Фарміраванне канцэпцый бібліятэчнага менеджменту.
18. Тыпалогія бібліятэчнага менеджменту.
19. Стратэгічнае кіраванне бібліятэчнай дзейнасцю.
20. Кіраванне інавацыйнымі працэсамі ў бібліятэцы.
21. Кіраванне персаналам бібліятэкі.
22. Бібліятэчнае абслугоўванне у сістэме маркетынга паслуг.
23. Маніторынг і аналіз бібліятэчнага асяроддзя.
24. Сучасныя праблемы каталагізацыі.
25. Уніфікацыя і стандартызацыя фарміравання бібліяграфічных запісаў.
26. Выкарыстанне ББК у якасці ІПМ пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Беларусі.
27. Праблемы выкарастання УДК у якасці ІПМ пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Беларусі.
28. Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі дакументаў.
29. Тэхналогія апрацоўкі дакументаў ў аўтаматызаваных інфармацыйна-пошукавых сістэмах.
30. Электронны каталог : яго арганізацыя, вядзенне, рэдагаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ